ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 18 (505) | Субота, 22 мая 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

НА XIX З'ЕЗДЗЕ ВЛКСМ

## БАЯВЫ АТРАД САВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ

Баявы авангард савецкай моладзі — камсамол заўсёды быў і застаецца школай палітычнага і грамадзянскага станаўлення юных. Галоўную задачу ён бачыць у тым, каб выхоўваць стойкіх барацьбітоў за неўміручыя ідэалы камунізму. Лепшых з лепшых — тых, хто заваяваў аўтарытэт і давер'е таварышаў беззапаветнай адданасцю партыі і народу, ударнай працай на вахце пяцігодкі, больш чым 41-мільённы атрад камсамоліі накіраваў на XIX з'езд ВЛКСМ.

Ён адкрыўся 18 мая ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

11 гадзін раніцы. Бурнымі працяглымі апладысментамі віталі прысутныя таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, М. С. Гарбачова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, А. Я. Пельшэ, М. А. Ціханава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, П. Н. Дземічава, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, М. В. Зімяніна.**

З'езд ВЛКСМ адкрыў першы сакратар ЦК ВЛКСМ Б. М. Пастухоў. Ён паведаміў, што кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы аднадушна выбраны дэлегатамі XIX з'езда ВЛКСМ. Ад імя ўсіх камсамольцаў і моладзі нашай Радзімы ён сардэчна вітаў Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева, членаў і кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС, сакратароў ЦК КПСС.

Пад гукі марша ў залу ўрачыста ўносяць Чырвоны сцяг Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, памятныя сцягі ЦК РКП(б) і ЦК КПСС.

Першы сакратар ЦК ВЛКСМ паведаміў, што для ўдзелу ў рабоце з'езда прыбылі прадстаўнікі шасці міжнародных арганізацый, 140 камуністычных саюзаў моладзі, дэмакратычных і сацыялістычных маладзёжных арганізацый са 110 краін.

Ад імя дэлегатаў з'езда ён запэўніў зарубежных гасцей у тым, што Ленінскі камсамол, уся савецкая моладзь лічаць інтэрнацыянальным абавязкам і ў далейшым умацоўваць баявую салідарнасць з прагрэсіўным юнацтвам усіх краін, няўхільна кіравацца прынцыпамі пралетарскага інтэрнацыяналізму, змагацца за адзінства і згуртаванасць радоў міжнароднага дэмакратычнага маладзёжнага руху.

З натхненнем з'езд выбраў ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым.

Выбіраюцца кіруючыя органы з'езда: прэзідыум, сакратарыят, рэдакцыйная і мандатная камісіі.

Аднагалосна зацвярджаецца парадак дня з'езда:

1. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.
2. Справаздачны даклад Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі ВЛКСМ.
3. Выбары цэнтральных органаў ВЛКСМ.

Слова атрымлівае Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР **Л. І. Брэжнеў.**

Прысутныя ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў з велізарнай увагай выслухалі прамову таварыша Л. І. Брэжнева «Клопаты аб інтарэсах народа — справа гонару камсамола».

Затым з дакладам «Справаздача ЦК ВЛКСМ і задачы Ленінскага камсамола па фарміраванню пакалення людзей палітычна актыўных, якія ведаюць справу, любяць працу і ўмеюць працаваць, заўсёды гатовы да абароны сваёй Радзімы» выступіў першы сакратар ЦК ВЛКСМ **Б. М. Пастухоў.**

Са справаздачным дакладам Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі ВЛКСМ XIX з'езду камсамола выступіў яе старшыня **Е. М. Глушкевіч.**

З дакладам мандатнай камісіі выступіў яе старшыня **В. М. Мішын.**

Затым на з'ездзе пачалося абмеркаванне справаздачных дакладаў ЦК ВЛКСМ і Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі камсамола.

Дэлегаты і госці з'езда наведалі Маўзалей У. І. Леніна і ўсклалі вянок. Вянок быў ускладзен таксама да магілы Невядомага салдата ля Крамлёўскай сцяны.

Вечарам для дэлегатаў і гасцей XIX з'езда ВЛКСМ быў дадзен урачысты канцэрт майстроў мастацтваў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

**(Працяг на 2-й стар.).**

## ТЭЛЕГРАМЫ

### XIX З'ЕЗДУ УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ

Шматтысячная камсамольская арганізацыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта горача вітае дэлегатаў XIX з'езда ВЛКСМ, усю савецкую моладзь — дастойных прадаўжальнікаў ленінскіх запаветаў і актыўных будаўнікоў камунізму.

Мы спадзяемся, што XIX з'езд ВЛКСМ увойдзе значнай падзеяй у слаўную і гераічную біяграфію юнацтва Краіны Саветаў, стане пачаткам новага этапа работы па ажыццяўленню ленінскіх запаветаў і рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта азнаменуюць дні работы з'езда новымі поспехамі ў вучобе, грамадскай рабоце, падрыхтоўцы да трэцяга працоўнага семестра, будуць працягваць авалодваць ідэйным багаццем рэвалюцыйнай тэорыі, вучыцца кіравацца ёй у паўсядзённым практычным жыцці, аддаваць усе свае сілы, веды, запал сваіх гарачых камсамольскіх сэрцаў барацьбе за справу У. І. Леніна, роднай Камуністычнай партыі—за выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

**Прынята на сходзе камсамольскага актыву Гомельскага дзяржаўнага універсітэта 17 мая 1982 года.**

* * *

Камсамольская арганізацыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта дакладвае XIX з'езду ВЛКСМ, што зводны студэнцкі будаўнічы атрад у колькасці 1215 чалавек да трэцяга працоўнага семестра гатовы.

У год XIX з'езда ВЛКСМ і 60-годдзя ўтварэння СССР кожны трэці студэнт выязджае ў саставе СБА на ўдарныя камсамольскія будоўлі.

Запэўніваем Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ, што трэці працоўны семестр 1982 года будзе здадзены на «выдатна» і байцы зводнага СБА ўнясуць дастойны ўклад у выкананне заданняў XI пяцігодкі.

## XIX З'ЕЗДУ УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ

**Дарагія таварышы! Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза горача і сардэчна вітае дэлегатаў XIX з'езда ВЛКСМ, усіх камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат краіны.**

**Партыя высока цэніць Ленінскі камсамол як свой надзейны рэзерв, як актыўнага памочніка ў рэвалюцыйным пераўтварэнні грамадства, у барацьбе за камунізм. Мільёны савецкіх людзей праходзяць у ВЛКСМ вялікую школу палітычнага і грамадзянскага станаўлення. Беззапаветным служэннем Айчыне камсамол здабыў глыбокую павагу ўсяго народа.**

**Маладыя людзі, якім сёння 18—25 гадоў, заўтра, — як падкрэслівае таварыш Л. І. Брэжнеў, — утвораць касцяк нашага грамадства. Гэтым вызначаецца высокая адказнасць камсамола за выхаванне моладзі. Садзейнічаць фарміраванню пакалення людзей палітычна актыўных, ведаючых справу, заўсёды гатовых да абароны Радзімы, — вось самае важнае, самае галоўнае ў рабоце камсамола.**

**Грамадства развітога сацыялізму прадастаўляе найшырэйшыя магчымасці для праяўлення лепшых якасцей савецкіх юнакоў і дзяўчат — імкнення да авалодання вышынямі навукі і культуры, да ўстанаўлення самых справядлівых, заснаваных на калектывізме адносін паміж людзьмі, умення пераадольваць цяжкасці. Абавязак камсамола — дабівацца, каб светлыя імкненні, смелыя планы і мары моладзі найбольш поўна рэалізоўваліся ў стваральнай рабоце і грамадскай дзейнасці, у напружанай вучобе, узорнай воінскай службе. Важна, каб ленінскі запавет — у агульнай працы з рабочымі і сялянамі выхоўваць з сябе камуністаў — паслядоўна ажыццяўлялася.**

**Разам з усім савецкім народам камсамольцы, юнакі і дзяўчаты краіны актыўна змагаюцца за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС. Шырокі размах атрымаў рух пад дэвізам «Адзінаццатай пяцігодцы — ударную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!» Сотні тысяч камсамольцаў, маладых энтузіястаў, прымнажаючы працоўную славу ВЛКСМ, асвойваюць прыродныя багацці Сібіры, Крайняй Поўначы і Далёкага Усходу, ставяць іх на службу народу. Задача камсамола — актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі важнейшай устаноўкі партыі аб павышэнні эфектыўнасці народнай гаспадаркі, яе інтэнсіфікацыі.**

**ЦК КПСС заклікае юнакоў і дзяўчат актыўна ўключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва за паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэнне прадукцыйнасці і якасці працы, за паспяховае выкананне планаў і сацыялістычных абавязацельстваў 1982 года і ўсёй адзінаццатай пяцігодкі. Абавязак камсамольскіх арганізацый — прывіваць моладзі пачуццё беражлівых, гаспадарскіх адносін да народнага дабра, высокую свядомую дысцыпліну.**

**Партыя разлічвае на дзейны ўдзел Ленінскага камсамола ў далейшым уздыме сельскай гаспадаркі, у выкананні харчовай праграмы. Высакароднай справай ВЛКСМ з'яўляецца выхаванне ў моладзі любві да зямлі і сельскай працы, ахова роднай прыроды.**

**Камітэты камсамола заклікаиы выпрацоўваць у маладых людзей адказныя, творчыя адносіны да вучобы, дабівацца, каб за школьнай партай, у майстэрні прафтэхвучылішча, студэнцкай аўдыторыі рыхтавалася дастойная працоўная змена. Неабходна ўсямерна ўдасканальваць рух студэнцкіх будаўнічых атрадаў і працоўных аб'яднанняў навучэнцаў.**

**Камсамолу трэба будзе і ў далейшым развіваць і ўдасканальваць работу Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, дапамагаць будаваць жыццё атрадаў і дружын змястоўна, падтрымліваць дух рамантыкі ў іх справах.**

**Камсамолам набыт багаты вопыт фарміравання ў моладзі марксісцка-ленінскага светапогляду і класавай свядомасці. Неабходна і ў далейшым нястомна выхоўваць юнакоў і дзяўчат у духу камуністычнай ідэйнасці, вернасці рэвалюцыйным, баявым і працоўным традыцыям Камуністычнай партыі і савецкага народа, высокай маральнасці, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі, праяўленняў антыграмадскіх паводзін, спажывецкіх адносін да жыцця, чужых нашаму грамадству нораваў. Вельмі важна дапамагаць моладзі рацыянальна выкарыстоўваць вольны час. Палітычную і арганізатарскую работу трэба весці ў цеснай сувязі з жыццём, наступальна, страсна, пастаянна ўлічваючы спецыфіку розных катэгорый моладзі, яе адукацыйны і культурны ўзровень, узроставыя інтарэсы і запатрабаванні.**

**Камсамольскія арганізацыі заклікаиы прывіваць маладому пакаленню пачуццё адказнасці за лёс сацыялізму, працвітанне і магутнасць Радзімы. Гэта асабліва важна ва ўмовах узрослай агрэсіўнасці імперыялізму. Свяшчэнны абавязак Ленінскага камсамола — мэтанакіравана весці ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі, падрыхтоўку яе да службы ва Ўзброеных Сілах СССР. Камсамольцы, усе юнакі і дзяўчаты павінны рэгулярна займацца фізкультурай, спортам, турызмам, авалодваць ваенна-тэхнічнымі ведамі.**

**У вырашэнні пытанняў выхавання, працы, вучобы, быту і адпачынку моладзі камітэтам камсамола трэба цясней супрацоўнічаць з савецкімі, гаспадарчымі, прафсаюзнымі і творчымі арганізацыямі. Неабходна шырэй уцягваць юнакоў і дзяўчат у кіраванне грамадскімі і дзяржаўнымі справамі.**

**Гэты год — год слаўнага шасцідзесяцігоддзя Саюза ССР. Гісторыя пацвердзіла жыватворную сілу адзінства, дружбы і брацтва ўсіх нацый і народнасцей краіны. Маладым патрыётам-інтэрнацыяналістам неабходна ўмацоўваць і прымнажаць гэты наш бясцэнны набытак.**

**Камсамол заклікан і ў далейшым паглыбляць усебаковае супрацоўніцтва, умацоўваць дружбу з саюзамі моладзі брацкіх краін сацыялізму, адзінства дзеянняў з камуністычным і ўсім прагрэсіўным маладзёжным рухам, дабівацца аб'яднання намаганняў юнацтва планеты ў барацьбе за трывалы мір, супраць пагрозы вайны.**

**ЦК КПСС упэўнен, што XIX з'езд ВЛКСМ стане важнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці краіны і намеціць у святле рашэнняў XXVI з'езда партыі, указанняў Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева шляхі далейшага паляпшэння дзейнасці камсамольскіх арганізацый, павышэння іх баявітасці. Няма сумнення, што савецкія юнакі і дзяўчаты ўпішуць новыя яркія старонкі ў летапіс гераічных здзяйсненняў нашага народа, будуць вучыцца жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму.**

**Няхай жыве Ленінскі камсамол — перадавы атрад маладых будаўнікоў камунізму!**

**Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!**

**Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад, да перамогі камунізму!**

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

*Экзаменацыйнай сесіі — узорную падрыхтоўку*

# ВАЖНАЯ ЗАДАЧА

Для падрыхтоўкі будучых спецыялістаў першаступеннае значэнне мае глыбокае вывучэнне студэнтамі грамадскіх навук: гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковага камунізму. Роля марксісцка-ленінскай тэорыі ў працэсе камуністычнага будаўніцтва ўвесь час узрастае па меры павелічэння маштабаў нашай эканомікі, ускладнення народнагаспадарчых сувязей, разгортвання навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, абвастрэння ідэалагічнай барацьбы паміж сацыялізмам і капіталізмам. Таму глыбокае вывучэнне студэнтамі грамадскіх навук, фарміраванне ў моладзі навуковага светапогляду з'яўляецца важнейшай задачай вучэбнага працэсу і самастойнай работы студэнтаў.

Большая частка студэнтаў адносіцца да вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі з вялікай адказнасцю і паказвае на экзаменах глыбокія трывалыя веды. Залогам высокай паспяховасці па грамадскіх навуках служаць добрае наведванне лекцый і семінарскіх заняткаў, напружаная работа над вучэбным матэрыялам, глыбокае вывучэнне прац К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, дакументаў КПСС і Савецкага ўрада, дакладаў і выступленняў Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева. Важным з'яўляецца творчы падыход да вывучэння грамадскіх навук, уменне цесна звязаць тэорыю з жыццём, практыкай рэалізацыі ўнутранай і знешняй палітыкі КПСС, іншых камуністычных і рабочых партый.

Значнае месца ў вывучэнні грамадскіх навук займае самастойная работа студэнтаў. У пазавучэбны час яны павінны як мага паўней і глыбей засвойваць вучэбны матэрыял па тэматыцы заняткаў, добрасумленна вывучаць і канспектаваць першакрыніцы, разабрацца ў найбольш складаных пытаннях. Пажадана паўней выкарыстоўваць кансультацыі, рэгулярна звяртацца за дапамогай да выкладчыкаў у працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў па грамадскіх навуках. Дзейсную дапамогу сваім таварышам могуць аказаць выдатнікі вучобы, старасты і камсоргі груп, камсамольскія актывісты.

Да пачатку летняй экзаменацыйнай сесіі засталося зусім мала часу. Пры падрыхтоўцы да экзаменаў па грамадскіх навуках неабходна старанна папрацаваць над матэрыялам, паўтарыць яго, звярнуць асаблівую ўвагу на веданне найбольш складаных раздзелаў і пытанняў вучэбнага курса, першакрыніц класікаў марксізму-ленінізму, матэрыялаў XXVI з'езда КПСС, дакументаў партыі і ўрада, выступленняў тав. Л. І. Брэжнева і пастановы ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

**У. БОНДАРАЎ,**
**загадчык кафедры палітычнай эканоміі, дацэнт.**

*Твой малодшы брат*

# ПАСЯБРАВАЛІ

НЕЯК на адно з пасяджэнняў нашага камсамольскага бюро факультэта зайшоў сакратар камітэта камсамола ГДУ С. У. Аўсеенка. Размова зайшла аб жыцці студэнтаў, аб справах, якія аб'ядноўваюць, згуртоўваюць увесь факультэт у цэлым. «Кожны факультэт павінен мець свой твар, — гаварыў Сяргей Уладзіміравіч, — а твар гэты — вашы справы, прычым, справы наватарскія. Не абавязкова ў сэнсе іх адкрыцця — а ў сэнсе падыходу».

Так узнікла ідэя ўзяць калектыўнае шэфства над дзіцячым домам або інтэрнатам. С. У. Аўсеенка дапамог знайсці нам дзіцячы калектыў, які сапраўды адчуваў патрэбу ў дапамозе старэйшых таварышаў. Гэта была школа-інтэрнат № 3. Мы паехалі ў інтэрнат. Пазнаёміліся з настаўнікамі і выхавацелямі рабят. Старшая піянерважатая школы прыйшла да нас на пасяджэнне бюро, расказала аб умовах жыцця і быту школьнікаў, аб праблемах, якія ўзнікаюць у рабоце з імі. Бюро пастанавіла вынесці пытанне аб шэфстве над інтэрнатам на абмеркаванне ў групах.

Першы візіт у школу адбыўся напярэдадні 23 лютага. П. Балабан, С. Лягін, Ю. Кірэйчук рыхтавалі рабят шостых, сёмых і восьмых класаў да конкурсу «Ану, хлопцы!» Конкурс прайшоў добра. Рабяты паказалі трывалыя веды і ўменне па ваеннай і спартыўнай падрыхтоўцы.

Для старэйшых школьнікаў і піянераў зараз ужо працуюць гурткі і спартыўныя секцыі. Асабліва хочацца адзначыць А. Русецкага, які арганізаваў і вядзе астранамічны гурток. Кожны аўторак збіраецца група зацікаўленых і дапытлівых рабят. Яны добра засвоілі будову тэлескопа, зараз вывучаюць зоркавае неба на практыцы, слухаюць даклады па тэарэтычных асновах астраноміі, знаёмяцца з яе дасягненнямі, загадкамі і праблемамі.

Нямала часу адводзіць камсорг групы Ф-44 Алег Шапараў для заняткаў з рабятамі ў валейбольнай секцыі. Выхаванцы не толькі загартоўваюцца фізічна, але і ажываюць душой, таму што бачаць чулыя, добрыя адносіны да іх. Дапамагае Алег рабятам і ў афармленні піянерскага пакою.

А над малышамі з першага, другога і трэцяга класаў узялі шэфства студэнцкія групы Ф-12, Ф-13, Ф-21 і Ф-22. Студэнты імкнуцца быць клапатлівымі сябрамі дзяцей, як мага часцей дастаўляць ім радасць.

Калі прымаліся сацыялістычныя абавязацельствы камсамольскай арганізацыі факультэта па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ, мы не забылі і пра сваіх падшэфных. Днямі піянерыя краіны адзначыла шасцідзесяцігоддзе сваёй арганізацыі. Да гэтага дня мы і рыхтавалі свой падарунак. Было вырашана, што чацвёрты курс будзе працаваць у вольны ад заняткаў час на гармалзаводзе, а грошы, якія будуць зароблены, пойдуць на падарункі для школьнікаў. Так і зрабілі. Зарабілі 112 рублёў. На іх набылі спартыўныя прылады, прылады для гульняў. І 18 мая на ўрачыстым зборы дружыны ўсё гэта падарылі дзецям. Малодшым з іх прынеслі маляўнічыя цікавыя кнігі. Потым выступілі з невялічкім канцэртам, расказалі аб жыцці нашага факультэта.

Не ўсё і не заўсёды нам удаецца. Сваю ролю ў гэтым адыгрывае і тое, што мы вучымся ў другую змену. Але мы не спыняем сваёй работы. Ёсць ужо новыя планы, ёсць аддача ад зробленага. Мы яе добра адчуваем па той сяброўскай атмасферы, якая сустракае нас у інтэрнаце.

**Галіна КАВАЛЁВА,**
**адказная за работу шэфскага сектара камсамольскага бюро фізічнага факультэта.**

# НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СТУДЭНТАЎ

На біялагічным факультэце адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР. Упершыню на канферэнцыі такога роду працавала падсекцыя хіміі.

Тэматыка дакладаў выклікала вялікую цікавасць у студэнтаў: на другі дзень работы падсекцыі колькасць студэнтаў, якія прысутнічалі ў канферэнц-зале, узрасла ў многа разоў. Асабліва хочацца адзначыць даклады нашых першакурснікаў. Яны насілі рэфератыўны характар. З увагай былі выслуханы даклады студэнтак першага курса Э. Рэзванавай і З. Купо аб адкрыцці і даследаванні трансуранавых элементаў, аб будучым перыядычнай сістэмы Д. І. Мендзялеева. Студэнтка першага курса Н. Калеснікава расказала аб даследаваннях біялагічнай карозіі. Тэма гэтая ў апошні час увайшла ў лік актуальных: у Ленінградзе створаны Усесаюзны цэнтр па даследаванню біялагічнай карозіі і метадаў барацьбы з ёю. В. Маісеенка пазнаёміла прысутных з матэрыяламі даследаванняў па азонаваму шчыту нашай планеты. Асноўная ідэя паведамлення — беражыце прыроду, ваду, паветра, разумна карыстайцеся ўсім гэтым. Аб сучасных метадах аналізу касмічных аб'ектаў, перспектывах іх развіцця расказалі студэнткі С. Марцьянава і Г. Курапаткіна.

Студэнтка другога курса А. Старусева выступіла з дакладам «Іёнселектыўныя метады, іх цяперашняе і будучае», у якім пазнаёміла прысутных з перспектывамі развіцця новага аналітычнага метаду, які прымяняецца для аналіза прыродных вод. Студэнткі Г. Барскіх і І. Мрынская расказалі аб метадах даследавання глеб Беларусі на ўтрыманне ў іх макраэлементаў.

Удзельнікі канферэнцыі адзначылі цікавы даклад студэнткі трэцяга курса М. Макаравай «Электрафарэтычнае раздзяленне бялкоў раслін».

Затым адбылося абмеркаванне дакладаў, у якім прынялі ўдзел выкладчыкі кафедры хіміі і студэнты. Было падкрэслена, што не выпадкова работа падсекцыі хіміі ў першы ж раз дала такія вынікі. На працягу многіх гадоў на кафедры хіміі працуе студэнцкі хімічны гурток. Таму ўсе ўдзельнікі канферэнцыі маюць магчымасць займацца даследаваннямі пачынаючы з першага курса.

**А. СТАРУСЕВА,**
**старшыня секцыі хіміі, студэнтка другога курса;**
**Е. БАРАВІК,**
**сакратар секцыі, студэнтка трэцяга курса.**

*Увага: навуковы вопыт*

# ДЗЕЛАВЫЯ ГУЛЬНІ

Вядома, што прымяненне традыцыйных метадаў навучання — лекцый, практычных і семінарскіх заняткаў — не заўсёды дазваляе дабівацца жадаемага выніку — актыўнага ўспрыняцця матэрыялу ўсімі студэнтамі. Таму пытанні актывізацыі вучэбнага працэсу хвалююць выкладчыкаў ВНУ. Адной з форм актыўнага навучання з'яўляюцца дзелавыя гульні. У сістэме вышэйшай адукацыі СССР дзелавыя гульні пачалі прымяняць яшчэ ў 30-х гадах у ВНУ Ленінграда, Масквы, Харкава.

Абапіраючыся на савецкія прынцыпы пабудовы і методыку правядзення, Амерыканская асацыяцыя кіравання ў 1957 годзе ўвяла ў вучэбны працэс падрыхтоўкі «мэнеджэраў» — кіраўнікоў вытворчасці — першую за мяжой дзелавую гульню. За кароткі час у ЗША, Англіі, Францыі, ФРГ і іншых краінах атрымалі распаўсюджанне многія тыпы і варыянты дзелавых гульняў, якія з'яўляюцца неад'емным элементам падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і атэстацыі кіруючых, інжынерна-тэхнічных і эканамічных кадраў.

У 1981 годзе ў Маскоўскім інстытуце кіравання імя С. Арджанікідзе арганізаваны Цэнтр дзелавых гульняў. Работа Цэнтра вядзецца па прынцыпу абагульнення вопыту ВНУ краіны па распрацоўцы і прымяненню дзелавых гульняў у вучэбным працэсе.

Нядаўна адбылося пасяджэнне навукова-практычнага семінара Цэнтра дзелавых гульняў, у якім прынялі ўдзел выкладчыкі эканамічнага факультэта ГДУ. Характэрна, што работа Цэнтра прыцягнула ўвагу не толькі выкладчыкаў эканамічных дысцыплін: у семінары прымалі ўдзел і спецыялісты тэхнічных дысцыплін, псіхолагі, сацыёлагі, выкладчыкі кафедр замежных моў і іншыя спецыялісты.

Даклады і выступленні ўдзельнікаў семінара паказалі, што многія ВНУ краіны паспяхова ўкаранілі дзелавыя гульні ў вучэбны працэс. Значных поспехаў у гэтым напрамку дасягнуў Кіеўскі інжынерна-будаўнічы інстытут. У ім ужо створаны двухмесячныя курсы выкладчыкаў ВНУ па падрыхтоўцы кіраўнікоў дзелавых гульняў.

У Маскоўскім інстытуце кіравання імя С. Арджанікідзе паспяхова прымяняюцца таксама такія дзелавыя гульні, як «Удасканаленне арганізацыі кіравання ў аб'екце кіравання», «Удасканаленне арганізацыі кіравання ў суб'екце кіравання», «Аптымізацыя вытворчай праграмы аб'яднання», «Плаванне тэмпаў і прапорцый грамадскай вытворчасці» і іншыя. Характэрна, што ўсе дзелавыя гульні будуюцца на выкарыстанні рэальных даных, на матэрыялах канкрэтных прадпрыемстваў, міністэрстваў, штогодных статыстычных зборнікаў «Народная гаспадарка СССР» і іншых фактычных матэрыялах. Адэскі інстытут народнай гаспадаркі праводзіць, напрыклад, каля 20 дзелавых гульняў. Цікавая дзелавая гульня «Вучэбная бухгалтэрыя», якая праводзіцца дзвюма кафедрамі — бухгалтарскага ўліку і АМАЭІ. Чэлябінскі інстытут назапасіў значны вопыт па правядзенню комплексных гульняў. Тут абсталяваны чатыры залы для гульняў. Вялікую цікавасць удзельнікаў семінара выклікалі дзелавыя гульні кафедры эканамічнай кібернетыкі Маскоўскага інстытута кіравання па даследаванню варыянтаў прыняцця аптымальных рашэнняў. Кафедра сацыялогіі і псіхалогіі гэтага ж інстытута паказала методыку і спецыфіку пабудовы псіхалагічных дзелавых гульняў. Быў праведзены аналіз асобных з іх — «Сумяшчальнасць», «Характарыстыка», «Асоба на рабоце», «Прыём на работу», «Інтэрв'ю», «Атэстацыя», «Праблематыка», «Брыгада», «Красворд».

У Вінніцкім політэхнічным інстытуце на занятках па замежнай мове вырашаюцца розныя сітуацыі гульні. Для гэтага папярэдне распрацоўваецца сцэнарый, які імітуе зносіны супрацоўнікаў ва ўмовах будучай спецыяльнасці. Спецыялісты кафедры лічаць, што такая форма навучання дапамагае пераадолець абыякавасць і інертнасць студэнтаў пры шматразовым паўтарэнні аднаго і таго ж матэрыялу і садзейнічае набыццю глыбокіх ведаў замежнай мовы. Зараз студэнты лёгка чытаюць замежныя часопісы.

Вялікая цікавасць да дзелавых гульняў тлумачыцца іх несумненнымі перавагамі, якія садзейнічаюць актыўнасці студэнтаў; дапамагаюць дасягнуць высокай інтэнсіўнасці інтэлектуальнай работы, што дазваляе трывала засвойваць да дзевяноста працэнтаў вучэбнага матэрыялу; набліжаюць навучанне да рэальных вытворчых умоў ці ўмоў будучай спецыяльнасці; вучаць студэнтаў культуры зносін, уменню слухаць і выказвацца самім без эмоцый.

Вопыт паказвае, што дзелавая гульня можа быць праведзена паспяхова ў тым выпадку, калі яна загадзя якасна падрыхтавана. Напрыклад, на распрацоўку дзелавой гульні «Удасканаленне арганізацыі кіравання ў аб'екце і суб'екце кіравання» выкладчыку спатрэбілася 68 гадзін, студэнтам — 32 гадзіны. Большая частка работы праводзіцца не ў час заняткаў, а пасля іх. Таму ва ўмовах, калі вучэбныя планы яшчэ не прадугледжваюць часу на правядзенне дзелавых гульняў, патрэбны энтузіязм і ініцыятыва выкладчыка. Тым не менш, выкарыстанне ў вучэбным працэсе ўжо распрацаваных у іншых ВНУ і правераных на практыцы дзелавых гульняў значна скарачае падрыхтоўчы этап іх укаранення.

**І. ТРАЦЭЎСКІ,**
**дэкан эканомфака.**
**Л. ЛАЗУЧЭНКАВА,**
**дацэнт кафедры эканомікі працы.**

*Векапомнае*

# ДА ПАРТЫЗАНСКАЙ КРЫНІЧКІ

Адной з форм далучэння камсамольцаў да гераічнага мінулага нашай краіны сталі паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. На беларускай зямлі многа помнікаў тым, хто загінуў у баях за вызваленне Радзімы ад фашысцкіх акупантаў. Гэта — даніна павагі і ўдзячнасці ўсіх жывых.

Кожны год камсамольцы нашага універсітэта ў адзін з майскіх дзён ідуць да партызанскай крынічкі. Яны прыносяць кветкі да помніка загінуўшым. Вось і сёлета адбыўся такі паход. Мы ішлі лясной дарогай сонечным майскім ранкам і імкнуліся ўявіць сабе такі ж ранак сорак гадоў назад, калі зямля наша была ахоплена полымем вайны. Вось за паваротам паказалася палянка, легендарная крынічка, абеліск... Усе мы адчулі хваляванне, напружана застукалі сэрцы. На нейкае імгненне перад вачамі мільгануў касцёр, каля якога партызаны, зруб крынічкі... Усё гэта ўжо стала гісторыяй, менавіта таму паляна і крынічка з «жывой вадой» — святыня для нас.

Сёлетні паход знамянальны яшчэ і тым, што ён праходзіў напярэдадні XIX з'езда камсамола. Адказнасць моладзі за мір на нашай планеце асабліва падкрэсліваў і Пётр Андрэевіч Дуброўскі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, які прыйшоў разам з намі да партызанскай крынічкі, падзяліўся ўспамінамі аб тых грозных часах. На памяць аб сустрэчы мы падарылі Пятру Андрэевічу кнігі, прыпаднеслі кветкі.

**Анатоль БРЭЛЬ,**
**слухач групы рускай мовы і літаратуры падрыхтоўчага аддзялення.**



**Гасцямі нашага універсітэта на гэтым тыдні былі артысты з Вільнюса. У актавай зале выступіў камерны квартэт імя Чурлёніса. Гарачымі апладысментамі дзякавалі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ ўдзельнікам фестывалю мастацтваў «Гомельская музычная вясна».**

Фота **У. Чысціка.**

*Наш адпачынак*

# З ВЫДАТНЫМ НАСТРОЕМ

У нядзелю ў прыгожым бярозавым гаі на беразе Сожа сабраліся студэнты эканомфака на свае традыцыйныя «Вясеннія дні эканаміста». Гэтая добрая факультэцкая традыцыя, якая, на жаль, была забыта ў апошнія гады, зноў адноўлена.

Разнастайная, насычаная праграма свята нікога не пакінула абыякавымі. Увесь дзень у гаі гучала музыка, песні, панаваў прыўзняты настрой. Праводзіліся розныя спартыўныя спаборніцтвы: устаноўка палаткі, падняцце гіры, адбыліся гульні ў валейбол, футбол. Пераможцаў спаборніцтваў узнагародзілі прызамі. Яшчэ надоўга б хапіла студэнцкага запалу, весялосці, гумару, але час праляцеў хутка і трэба было вяртацца дамоў.

На развітанне ўсе сабраліся каля кастра, дзе традыцыйнае свята было ўрачыста закрыта. Успаміны аб ім застануцца ва ўсіх яго ўдзельнікаў надоўга!

**А. МАТОРАНКА,**
**студэнт групы 0-43 эканамічнага факультэта.**

*На кніжнай паліцы*

# ЛІТАРАТУРА ПА КАМУНІСТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ

**Таварыш камсамол. ЛКСМБ ад з'езда да з'езда.** Мн., «Беларусь», 1982.

**ЗАТВАРНІЦКІ В. А. Адносіны да працы — камуністычныя.** М., Прафвыдат, 1981.

**Камуністычнае выхаванне студэнтаў у выкладанні палітычнай эканоміі.** М., «Высшая школа», 1982.

**КУЗЬМІЧОЎ І. Літаратура і маральнае выхаванне асобы.** М., «Просвещение», 1980.

**Камуністычнае выхаванне вучняў на ўроках гісторыі, грамадазнаўства і асноў савецкай дзяржавы і права.** М., «Просвещение».

**ІВАШЧАНКА А. В. Ідэйна-маральнае выхаванне старэйшых школьнікаў.** М., «Просвещение».

**БАГАЛЮБАЎ А. Н. Ідэйнае выхаванне на ўроках гісторыі.** М., «Просвещение», 1981.

**Раскрыццё кіруючай ролі КПСС пры вывучэнні пытанняў сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва.** М., «Просвещение», 1981.

Кнігі ёсць у продажы ў кнігарні № 19 па вул. Савецкай, 106.

# СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА-82



**На здымку: выступаюць удзельнікі танца**вальнага **калектыву ГДУ.**

Фота **У. Чысціка.**

Фестываль мастацкай самадзейнасці «Студэнцкая вясна-82», які праходзіў з 13 па 15 мая ў Палацы культуры і тэхнікі імя У. І. Леніна, пераканаўча засведчыў: сярод студэнцкай моладзі ёсць здольныя, таленавітыя юнакі і дзяўчаты.

У традыцыйным аглядзе-конкурсе студэнцкіх талентаў, які ў гэтым годзе па ініцыятыве дырэктараў клубаў мастацкай самадзейнасці ВНУ горада праводзіўся як фестываль, прысвячаўся 60-годдзю ўтварэння СССР. На працягу трох дзён паказвалі сваё майстэрства ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці ВНУ горада —нашага універсітэта, Беларускага інстытута чыгуначнага транспарту і політэхнічнага інстытута.

З поспехам прайшлі выступленні харавога, танцавальнага калектываў ГДУ. Вельмі цёпла прымалі журы і гледачы іншых удзельнікаў фестывалю — прадстаўнікоў ГДУ — Ю. Кароўкіна, які выконваў музычныя творы на класічнай гітары, М. Каняхіна і А. Дашкоўскага з іх мініяцюрамі, А. Сыса, які чытаў свае пароды і інш. Асаблівы поспех спадарожнічаў ВІА «Радзімічы» — лаўрэату прэміі камсамола Гомельшчыны.

Цікавую літаратурна-музычную кампазіцыю падрыхтавалі да фестывалю студэнты БІЧТу. З ёй выступіў агіттэатр інстытута «Карчагінцы». Кампазіцыя прасочвала той шлях, які прайшла наша краіна за свае 60 гадоў.

Гледачамі — камсамольцамі ВНУ, прадпрыемстваў горада цёпла прымаліся і нумары, з якімі выступалі студэнты політэхнічнага інстытута. Выканаўцы лепшых нумароў фестывалю будуць узнагароджаны граматамі, дыпломамі гаркома камсамола, гарадскога аддзела культуры.

**(Наш кар.).**

*Гэта цікава*

# ПІШУЧАЯ МАШЫНКА З ДЗЕСЯЦЦЮ КЛАВІШАМІ

Пішучая машынка даўно ўжо перастала хваляваць розум вынаходнікаў. Яна з'явілася на свет яшчэ ў мінулым стагоддзі і была столькі разоў дапрацавана, што сёння ў ёй, здавалася б, і ўдасканальваць ужо няма чаго... А вось ленінградскі вынаходнік Ф. Каляда знайшоў «недапрацоўкі» і ў сучаснай пішучай машынцы. Каб скараціць хуткасць друкавання, ён прапанаваў просты і арыгінальны спосаб— скараціць колькасць літарных клавішаў на клавіятуры машынкі да дзесяці.

Міжвольна ўзнікае пытанне: літар жа больш, чым дзесяць, ды яшчэ знакі прыпынку, лічбы... Як жа без іх? Усе яны ўлічаны ў арыгінальнай канструкцыі, якую стварыў ленінградскі вынаходнік.

Цяпер слова за спецыялістамі. Першыя выпрабаванні паказалі, што пакольні пераносу пальцаў на клавіятуры амаль няма, то хуткасць работы на такой машынцы рэзка ўзрастае, зніжаецца стамляемасць.

**С. СМІРНОВА.**

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

## «ПЕРАЎВАСОБІЎСЯ...»

Аднойчы да нас прыехаў вядомы ўрач-псіхіатр, які свабодна валодае сродкамі гіпнозу. У сваёй лабараторыі ён праводзіць цікавыя эксперыменты па выяўленню ў людзей творчых схільнасцей. Сутнасць вопыту заключаецца ў наступным: чалавеку пад гіпнозам унушаецца, што ён — выдатны дзеяч навукі ці мастацтва. Пераўвасабленні бываюць надзвычайныя!

Пасля тэарэтычнай часткі выступлення пачалася дэманстрацыя доследаў. Урач запрасіў жадаючага з залы. Выйшаў адзін студэнт. Пасля пэўных маніпуляцый гіпнацізёр ператварыў студэнта ў Пятра Ільіча Чайкоўскага.

«Пётр Ільіч» з вялікім натхненнем расказаў слухачам пра сваё разуменне музыкі, а калі гіпнацізёр спытаў яго, над чым ён зараз працуе, той з гонарам прамовіў:

— Над «Луннай» санатай...

Далейшую дэманстрацыю вопыта давялося спыніць — у зале стаяў неймаверны рогат.

*Спорт*

# ВЫКАНАНЫ ЗАПАВЕТНЫ НАРМАТЫЎ

Сёлета ў трэці раз праведзена адкрытае першынство Гомельскага аблсавета «Буравеснік» па фехтаванню. У спаборніцтвах прынялі ўдзел мушкецёры Ленінградскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту, Навапалацкага політэхнічнага і Мінскага радыётэхнічнага інстытутаў, нашага універсітэта. Сярод шпажыстаў пераможцам стаў гамяльчанін А. Шаршнёў, рапірыстаў — Г. Шакір'янава з Гомеля і В. Багданаў з горада на Няве. Член спартыўнага клуба ГДУ майстар спорту Р. Казусеў выйшаў пераможцам сярод саблістаў.

На турніры фехтавальшчыкаў вялікага поспеху дасягнула пяцікурсніца матэматычнага факультэта Таццяна Шасцярня. Яна заняла другое месца і выканала нарматыў для прысваення звання «Майстар спорту СССР».

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**трэнер.**

Рэдактар Ул. **БАЛОГА.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 20399.
Заказ 3156.